# Творчая сустрэча з Алегам Трусавым



8 жніўня ў менскай Галерэі "Ў" адбылася творчая сустрэча з Алегам Трусавым з нагоды яго 60-годдзя.

Уваход быў вольны, і зала аказалася паўнюткая.

60 год з дня нараджэння навукоўца, кандыдата гістарычных навук, дацэнта, а таксама палітыка, дэпутата Вярхоўнага Савета Беларусі, які абвяшчаў суверэнітэт і незалежнасць нашай краіны, супалі з 15-годдзем дзейнасці на пасадзе старшыні Грамадскага аб'яднання "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны".



І хоць віншаваць Алега Анатольевіча выходзілі ў першую чаргу гісторыкі, археолагі, сябры са студэнцкіх гадоў, а гэта Уладзімір Арлоў, Ігар Чарняўскі, Алесь Краўцэвіч, чые імёны добра вядомыя ў гістарычнай навуцы. Хоць першым павіншаваў юбіляра акадэмік Радзім Гарэцкі, а бліжэй да завяршэння віншавалі вучні Алега Анатольевіча, хто з універсітэта, хто з каледжа імя Я. Коласа, аднак у паветры над усім гэтым віселі тры словы *"Таварыства беларускай мовы"* ці тры літары *ТБМ*. Бо грамадская дзейнасць на пасадзе старшыні ТБМ у значнай ступені засланіла ўсё ранейшае, і Алег Трусаў успрымаецца сёння ў беларускім грамадстве перш за ўсё як старшыня Таварыства беларускай мовы, найбуйнейшай і найбольш паслядоўнай нацыянальна-патрыятычнай і адраджэнцкай грамадскай арганізацыі Беларусі. Таму не дзіўна, што павіншаваць Алега Трусава прыйшлі кіраўнікі сяброўскіх нацыянальных арганізацый - старшыня Таварыства беларускай школы Алесь Лозка і старшыня Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Антон Астаповіч.







ТБМ з'яўляецца ініцыятарам многіх праектаў і пачынанняў, якія вызначаюцца вялікім эфектам і папулярнасцю ў грамадстве. Чаго варты хаця б незалежны тэлеканал Белсат, ідэя якога нарадзілася ў ТБМ, або Гуманітарны ліцэй імя Якуба Коласа, да стварэння якога Алег Трусаў прыклаў руку персанальна і да гэтага часу выкладае ліцэістам гісторыю. Таму лагічна было бачыць тут і дырэктара ліцэя Уладзіміра Коласа.

Завяршылася імпрэза выступам слыннага барда Аляксея Галіча, а апошняй песняй стаў нацыянальны гімн беларусаў "Пагоня" на словы Максіма Багдановіча.

60 год да Алега Трусава прыйшлі, але працы не паменшала, бо ой як далёка нам яшчэ да сапраўднай беларускай Беларусі, а ісці трэба, і ТБМ мусіць быць наперадзе, і наперадзе мусіць быць старшыня Таварыства.

Дай жа яму, Божа, сілаў і здароўя на гэтым шляху, а вернасць і адданасць Беларусі ў спадара Трусава векавечныя і нязломныя.

*Яраслаў Грынкевіч.*

## *Дзякую за віншаванні!*

Выказваю шчырую падзяку ўсім сябрам, знаёмым і незнаёмым, хто павіншаваў мяне з 60-годдзем асабіста, па пошце, па тэлефоне, у прэсе і іншымі сродкамі.

Я ўспрымаю вашую ўвагу да сябе як высокую ацэнку той справы, якую мы робім разам з вамі па абароне нашай роднай беларускай мовы, нашых нацыянальных здабыткаў і каштоўнасцяў. Мне радасна, што шмат віншаванняў ад моладзі, бо ў моладзі бачым мы працяг нашых ідэяў і нашых справаў. Таму я смела і спакойна магу сказаць сёння: "Жыве Беларусь і будзе жыць!"

*Алег Трусаў.*